Л.Сіманёнак (верш “Дзьвіна”), як знак роднасці з пакінутай “малой” радзімай – у паэзіі А.Салтука, С. Валодзькі і іншых аўтараў.

Як магутная аб’яднальная сіла, што канцэнтруе ў сабе ідэю гістарычнага адзінства славянскіх народаў і іх дружбы з латышамі, выступае рака ў “Паэме аб Дзвіне” віцебскай паэтэсы Т.Красновай-Гусачэнкі, якая ўжывае не толькі сучасную назву Дзвіны, але і другія яе гістарычныя і рэгіянальныя назвы (Эрыдан, Рубон, Турун, Танаір, Радан, Дзіна, Віна), падкрэсліваючы шматзначны сэнс вобраза.

**Заключэнне.** Канцэптасфера паэзіі А.Салаўёва вызначаецца разнастайнасцю, гарманічным суіснаваннем універсальных і этнаспецыфічных латгальскіх канцэптаў, увасобленых з вялікай мастацкай пераканальнасцю. Асэнсаванне канцэпта “Дзвіна” ў паэзіі А.Салаўёва і віцебскіх аўтараў сведчыць пра агульныя вобразы ў літаратурах памежжа.

Спіс літаратуры


1. Соловьев, Алексей. На берегу большой реки: [стихи] / Алексей Соловьев; вступ. ст. Федора Федорова. – Даугавпилс : Hronos, 2012. – 260 с. : ил.
2. Соловьев, Алексей. Город чаек и лебедей: [стихи] / Алексей Соловьев. – Даугавпилс : [Б.и.], 2005. – 155 с.: ил.
3. Симанович Д. Избранное / Д.Симанович – Минск: Маст. літ., 1995. – 381 с.


## ВОБРАЗ МАЦІ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКАМОЎНАГА ПАЭТА ПОЛЬШЧЫ АЛЕСЯ БАРСКАГА


*І.В. Саматой*

*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Паэтычную спадчыну беларускамоўнага паэта Польшчы Алеся Барскага прэзентуюць наступныя зборнікі: “Белавежскія матывы” (1962), “Жнівень слоў” (1967), “Мой бераг” (1975), “Блізкасць далёкага” (1983), “Лірычны пульс” (1987). У іх выразна адлюстраваліся не толькі асабістыя пошукі і знаходкі, але і духоўныя памкненні чалавека беларуска-польскага памежжа. Алесь Барскі належыць да таго пакалення паэтаў-рамантыкаў, якое прыйшло ў нашу літаратуру ў пачатку 60-ых гадоў, зведаўшы трагедыю вайны, пасляваеннае аднаўленне, неспакойны, зменлівы час ХХ стагоддзя. Шляхі развіцця яго лірыкі шмат у чым абумоўлены актыўным развіццём грамадска-культурнага руху беларускай меншасці ў Польшчы, стварэннем мацерыка беларускасці на Беласточчыне. Мэта нашай працы – выяўленне спецыфікі адлюстравання вобраза жанчыны-маці ў творчасці Алеся Баркага.

**Матэрыял і метады.** Аб’ектамі даследавання сталі зборнікі А.Барскага “Лірычны пульс”, “Жнівень слоў”, “З пабачанага і перажытага”. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага і апісальнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. У сістэме мастацкіх катэгорый паэзіі А.Барскага вялікае месца займае жанчына, якая паўстае ў наступных архетыповых вобразах: жанчына-маці, жанчына-каханая, жанчына-дачка і г.д. Усе гэтыя архетыпы ў творчасці паэта з’яўляюцца суб’ектыўна пададзенымі, гэта значыць праз яго ўласнае ўспрыманне. Праз іх ідзе глыбокае філасофска-мастацкае спасціжэнне жыцця, часу. Звяртаючыся да традыцыйнага ў беларускай літаратуры вобраза маці, паэт шукае яго вытокі ў міфалогіі, фальклоры, дзе маці – сімвал жыцця, сімвал вечнасці. Архетып Маці ў творчасці А.Барскага годна ўпісваецца ў

Рэпазіторый ВДУ

жаночую галерэю нашай нацыянальнай літаратуры поруч з апаэтызаванымі вобразамі жанчын Я.Коласа, Я.Купалы, П.Броўкі, Н.Гілевіча, М.Танка, Р.Барадуліна. Заўважым, што ў творчасці беластоцкага паэта вобраз маці адметны рамантычнай узвышанасцю,лірычнай прачуласцю.

Выключнай шчырасцю, чуллівасцю і далікатнасцю напоўнены вершы, прысвечаныя высакароднаму вобразу маці, які з'яўляецца сімвалам жаночай дабрыні, ласкі, клопату.

Большасць вершаў А.Барскага напісана ад першай асобы, што сведчыць аб "аўтабіяграфічнасці" сюжэтаў і вобразаў. У сваёй публіцыстычнай кнізе "З пабачанага і перажытага" беластоцкі аўтар, узгадваючы мінулае, шчыра прызнаецца: "Прайшло многа часу з таго дзяцінства. Ужо чатырнаццаць гадоў не жыве мая маці. Аднак яе вобраз не зблякнуў і не пацямнеў у маёй удзячнай памяці. Асабліва ў часе бяссонных начэй, а часта і ў снах бачу яе пры кудзелі, дзяжы, жорнах. Бачу незаменную, незабыўную і святую. Мучаніцу, якая пусціла мяне на вольны свет, надзяліўшы пэўнымі ўласцівасцямі, дзякуючы якім магу аддзяліць дабро ад зла" [3, 17]. Успаміны аб маці сталіся крыніцай натхнення паэта і ўвасобіліся ў пранікнёных паэтычных радках. У вершах Алеся Барскага маці паўстае ў вобразе жанчыны-працаўніцы, захавальніцы сямейнага дабрабыту, вернымі спадарожнікамі якой былі "ціхі спеў калаўрота" [4, 51], "пах прэлага жыта на печы" [4, 51], "маленькі серпік" [4, 62], "бруістая песня-быліна для сына" [4, 51]. Жыццясцвярджальныя рысы святла і цяпла ўласцівы паэтычнаму вобразу жанчыны-маці, асабліва, калі гаворка ідзе пра яе рукі, вочы, усмешку – дамінуючыя мастацкія дэталі, якія дапамагаюць паэту ўзнавіць дарагі з маленства воблік.

Рукі маці ў вершах Алеся Барскага ("Шчырыя рукі растуць проста з сэрца", "Колькі разоў рукі маці прагналі трывогу", "Ліст да маткі") маюць сілу сонца: яны саграваюць і ахоўваюць, ім ён прыпісвае абстрактныя пачуцці: шчырасць, пяшчотнасць, чуллівасць:

Колькі раз рукі маці прагналі трывогу,
Колькі раз паказалі ў шчасце дарогу,
колькі раз адагналі з парога вы голад,
колькі раз абагрэлі ў сцюжу і холад,
колькі раз былі цішай і сном на павеках,
колькі раз павучалі, як быць чалавекам. [4, 70]

Ва унісон гэтаму вершу гучаць радкі Р.Барадуліна, які ўвекавечыў у беларускай літаратуры вобраз сваёй маці Куліны Андрэеўны:

Нам прыпомняцца рукі матчыны,
Што люлялі калыску, рукі.
Тыя добрыя рукі першымі
Ад зямлі нас паднялі ўгору… [1, 29]

У сталым узросце А.Барскі шукае позірк маці, яе вочы, якія з'яўляюцца самымі дарагімі:

І зноў дзяцінства
Радасны блакіт,
Матчын з-пад далоні
Позірк сіні
Шукаю я канца
Бясконцае ракі,
Хоць скроні серабрыць
Халодны іней [4, 83]

Репозиторий ВГУ

Сузор'ямі дабрыні і цяпла бачацца мацярынскія вочы ў паэтычных радках Р.Барадуліна.

Вобраз маці праходзіць праз усю творчасць паэта, канкрэтызуецца і набывае новыя рысы. Маці паўстае Мадоннай, Святой Заступніцай, паэт шукае яе падтрымкі ў спасціжэнні Айчыны і вяртанні да родных вытокаў, чакае матчынай малітвы "супраць злосці, хваробы і войнаў і бітваў, неўраджаяў…" [4, 69], просіць абароны ад чорнай зграі бяспамяцтва.

Гімн жанчыне і яе долі гучыць у вершах "Ліст да маткі", "Матчын хлеб", "Як лета пакліча…", "Бі мяне біткай". Увасабленнем ахвярнай і святой любові з'яўляецца постаць Маці, не выпадкова вылучаная творцам у архетыповыя сімвалы сваёй паэзіі.

У зборніку "Жнівень слоў" вобраз маці зліваецца з вобразам малой радзімы – Беласточчыны і набывае ўзвышанае, маштабнае значэнне. Да архетыпу маці далучаецца архетып Маці-Зямлі – прарадзіцелькі ўсяго жывога.

Уменне напоўніць змест твора універсальным сэнсам, праз уласнае, асабістае закрануць і ўсхваляваць чытача адчуваецца ў драматычных радках памяці роднага чалавека.

Паэт успамінае матчыны слёзы і надзеі, з пакораю гаворыць пра свае нягодныя ўчынкі і памылкі, просіць за іх прабачэнне:

…прабач усё тое, матуля,
што сам я сабе не прабачу [4, 52]

Матыў прабачэння, раскаяння гучыць і ў паэзіі Р.Барадуліна:

Даруй, што спазніўся
Пачуць тваё апошняе слова…
Даруй, што шчырасць тваю
Выстуджваў, як сівер, сурова [2, 61]

**Заключэнне.** Такім чынам, паэтычны вобраз у паэзіі А.Барскага выступае як адзіная форма існавання думкі і перажывання. Адным з асноўных архетыпаў у лірыцы паэта з'яўляецца вобраз маці: яго разнастайныя архетыпічныя ўяўленні. Па-першае, маці-ахоўніца сямейнага дабрабыту, па-другое, захавальніца роднага слова, аберагальніца традыцый, па-трэцяе, маці атаясамліваецца з вобразам малой радзімы –Беласточчыны. Усе гэтыя архетыпічныя ўвасабленні характарызуюцца адзінасцю і з'яўляюцца важнымі.

Спіс літаратуры.

1. Барадулін Р. Збор твораў у 5-ці т. Т. 1. Вершы / Прадм. В. Сёмухі. – Мн.: Маст. літ., 1996.
2. Барадулін Р. Маўчанне перуна: Новая кніга. – Мн.: Маст. літ., 1986.
3. Барскі А. З пабачанага і перажытага. – Мн.: Маст. літ., 1992.
4. Барскі А. Лірычны пульс: Вершы. – Мн.: Маст. літ., 1987.

## АСАБЛІВАСЦІ ЎЛАСНЫХ АСАБОВЫХ ІМЁН ЖЫХАРОЎ МЁРСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Г.К. Семянькова*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Рэгіянальная антрапанімія з'яўляецца нацыянальным здабыткам беларусаў і неад'емнай часткай лексічнай сістэмы беларускай мовы ў цэлым. Антрапонімы нярэдка ўтрымліваюць "зашыфраваную" інфармацыю пра шляхі гістарычнага

Репозиторий ВГУ